ЯК САБРАЦЬ ДЗІЦЯ Ў ЛАГЕР? 5

«НА БРОННАЙ ГАРЫ НЯМА ПАХАВАНЫХ...» 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

12 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.

СЕРАДА

№ 108 (28975)

ЗВЯЗДА

ПРАЦАВАЦЬ ДЗЕЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Прэзідэнт правёў кадравыя перастаноўкі

Юрый Караеў, намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі, будзе ўзначальваць МУС. Уладзімір Каранік, галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера, заменіць Валерыя Малашку на чале Міністэрства аховы здароўя. Разам з новымі міністрамі назначэнне на пасаду намесніка Дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі ў «кадравы» аўторак атрымаў Аляксандр Рахманаў. Васіль Герасімаў стане першым намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю. Яго былую пасаду (намесніка старшыні КДК) зойме Дзмітрый Баско. На другі тэрмін паўнамоцтваў назначана член праўлення Нацыянальнага банка Ілона Лядніцкая.

Таксама сёння Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў на пасады старшынь Магілёўскага і Лёзненскага райвыканкамаў — адпаведна Алега Чыкіду і Сяргея Зямчонка, а на месца кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна горада Магілёва — Аляксея Багайчука. Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь Воўк вернецца ў сферу прамысловасці: ён узгоднены генеральным дырэктарам ААТ «Мінскі трактарны завод». На вакантную пасаду намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама ўзгоднены Руслан Страхар, а членам Брэсцкага аблвыканкама — Дзмітрый Гарадзецкі.

ПРЫРОДА І ПАГОДА

У першую чаргу Прэзідэнт разгледзеў назначэнне кіруючых кадраў мясцовых органаў улады: старшынь Лёзненскага (Сяргея Зямчонка), Магілёўскага (Алега Чыкіду) райвыканкамаў і кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва (Аляксея Багайчука). Асноўная парада кадрам: быць бліжэй да людзей.

Новым кіраўнікам прыйдзецца вырашаць шматлікія пытанні сельскай гаспадаркі. «Мяне насцярожвае тая сітуацыя, якая складваецца (але яна неаднародная па краіне), у сувязі з кліматычнымі ўмовамі. Больш за ўсіх церпіць зараз цэнтр Беларусі. На ўсходзе хоць неяк, але праходзілі дажджы. Тэмпература больш-менш, я не скажу нармальная, але неяк можна трываць. Тут сітуацыя вельмі сур'ёзная», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы даў рэкамендацыі па аграрных пытаннях, каб не страціць пасеваў. Мінулы год быў неўраджайны, і амаль усе рэзервы збожжа-фуражу выкарыстаны. «Калі мы тое, што зараз росцім на збожжа, убяром у сянаж, траншэю, трэба папаўняць чымсьці збожжавую групу. І тут асаблівая надзея на кукурузу», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, сітуацыя ў Лёзненскім і Магілёўскім раёнах з-за структуры глебаў не такая складаная, як у цэнтральным рэгіёне.

Прэзідэнт звярнуў увагу на дрэнную работу Гідраметцэнтра Беларусі, на звесткі якога арыентуюцца аграрыі: «З ім трэба нешта рабіць: ці разганяць, ці прывесці ў прытомнасць. У лепшым выпадку ў якісьці дзень на 50—70 % апраўдвальнасць і дакладнасць прагнозаў».

Зноў успомніў кіраўнік краіны пра слабыя гаспадаркі. Іх трэба «ўзяць на буксір» прадпрыемствам. «Гэта адна-дзве, дзесьці тры гаспадаркі ў адным раёне. Па вобласці набярэцца 20—30 гаспадарак. Іх трэба размеркаваць і падтрымаць. У Магілёўскім раёне яны больш-менш нармальныя і павінны «выпаўзаць» з гэтага, — сказаў беларускі лідар.— Таму для нас вельмі важна зараз падтрымаць вёску. У гэты вельмі складаны перыяд нам ні ў якім разе нельга дапусціць спаду ў сельскай гаспадарцы».

Арыентавацца ў згаданай сферы эканомікі трэба на новыя кірункі, напрыклад, авечкагадоўлю. У краіне ёсць пустуючыя тэрыторыі, на якіх можна пасвіць гэтых непераборлівых жывёл. Раней у краіне трымалі сотні тысяч авечак. « Мне ўрад піша, проста брыдка чытаць. Калі я б не разумеў у гэтым нічога — можна было б адпіску гэту трываць. Да 2025 года яны дададуць 133 % авечак. То-бок авечкагадоўля будзе ў нас. Мы будзем авечак разводзіць — гэта воўна, аўчына, бараніна, быццам на рынку запатрабаваная. Карацей, будзем разводзіць гэтых авечак. Дык што такое 33 % да 2025 года? Гэта сёння адна авечка, заўтра будзе адна і тры дзясятыя авечкі. Ну што гэта за тэмпы?» — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. Прадукты авечкагадоўлі можна лёгка ўкараніць у прамысловасць. З воўнай працуе Камвольны камбінат, шматлікія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці могуць перапрацоўваць скуру.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў новым кіраўнікам пра будучую выбарчую кампанію. «Калі ласка, забяспечце дастойнае правядзенне гэтых кампаній, каб камар носа не падтачыў. У нас для гэтага ёсць усё. Мы так сабе вялікія. І я разумею, і вы разумееце, што народ ужо не памірае ад любові да нас. Але народ выдатна разумее, што дзеючая сёння ў Беларусі ўлада — гэта адзіная, унікальная з'ява не толькі на постсавецкай прасторы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2

АДЛІК ПАЧАЎСЯ

Абітурыенты здалі першыя тэсты

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Учарашні дзень атрымаўся гарачы ва ўсіх сэнсах: у 30-градусную спёку ў Беларусі стартавала цэнтралізаванае тэсціраванне. Нябесная канцылярыя аказалася да абітурыентаў нялітасцівай... Беларускую мову (а менавіта з тэста па роднай мове і распачаўся экзаменацыйны марафон) сёлета пажадала здаваць больш як 22 тысячы абітурыентаў. Для параўнання: на рускую мову зарэгістравалася амаль 63 тысячы чалавек.

Мінчанка Аксана СПІЧАКОВА, Кірыл КАЛЯГА з Докшыц, Дар'я ЯРАШЭВІЧ з Ганцавіцкага раёна і Мікіта ЕЎСТАФ'ЕЎ з гарадскога пасёлка Гарадзея Нясвіжскага раёна пазнаёміліся і пасябравалі на падрыхтоўчым аддзяленні БДМУ. Ніхто з іх не сумняваўся, якую мову ім здаваць на ЦТ, — вядома, беларускую!

Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт — адзін з 40 пунктаў правядзення ЦТ у нашай краіне. Учора ў шасці яго аўдыторыях павінны былі пісаць тэст 452 чалавекі, але, як заўсёды, пэўны працэнт з тых, хто зарэгістраваўся, на экзамен не прыйшлі. Рускую мову ў БДМУ будуць здаваць 798 чалавек, для іх давялося «браніраваць» ужо 11 аўдыторый.

Заблытацца ў калідорах медуніверсітэта немагчыма. Уся лагістыка добра прадуманая, паўсюль размешчаны паказальнікі-падказкі. На ўваходзе ўсе абітурыенты праходзяць строгі фэйс-кантроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». З ксеракопіяй пашпарта абітурыентаў не прапусцяць, як і з вадзіцельскім пасведчаннем. Перад аўдыторыяй абітурыенты праходзяць яшчэ адзін пашпартны кантроль і цягнуць нумар свайго месца ў аўдыторыі. Ад яго будзе залежаць варыянт тэста.

Высвятляецца, што адна з абітурыентак прыйшла на экзамен з даведкай з органаў унутраных спраў замест пашпарта, але паколькі фатаграфіі ў гэтым дакументе няма, яе на экзамен прапусціць не могуць — раяць пазней звярнуцца з «правільнай даведкай» у дзяржкамісію, каб быць дапушчанай да ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень.

— Шчыра кажучы, легкадумнасць абітурыентаў, якія здаюць пашпарт для адкрыцця візы ў час правядзення ЦТ ці для нейкіх іншых працэдур, нас здзіўляе. Няўжо для іх гэта больш важнае, чым прыёмная кампанія і паступленне? — заўважае **сакратар арганізацыйнай камісіі па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання на базе БДМУ Яўген ЧАРНАВУС.** — Мы маем права прапусціць абітурыента на ЦТ толькі з арыгіналам пашпарта, даведкай з відам на жыхарства або даведкай з органаў МУС устаноўленай формы, якая сведчыць аб страце галоўнага дакумента.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Асаблівасць сёлетняй уступнай кампаніі ў тым, што зніжана патрэба эканомікі ў спецыялістах юрыдычнага і эканамічнага профілю, але павялічана колькасць месцаў для тых, хто паступае на спецыяльнасці ІТ-сферы, медыцынскай галіны, фізічнага выхавання і спорту, а таксама аграрнага профілю. Цяпер выбудоўваем праграму, каб былі падрыхтаваныя тыя спецыялісты, у якіх у большай ступені мае патрэбу краіна. Да гэтага пытання падыходзім гнутка, разам з заказчыкамі і галінамі фарміруем план, распрацоўваем адпаведныя дакументы, каб навучыць студэнта неабходнаму».

ДЗЯЖУРСТВА — СУТКІ ПРАЗ СУТКІ

Як ратавальнікі рыхтуюцца да Гульняў?

Мы працягваем расказваць пра тое, як розныя ведамствы рыхтуюцца да II Еўрапейскіх гульняў. Сёння пад нашу ўвагу трапіла Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Менавіта ратавальнікам падчас якога-небудзь няштатнага здарэння давядзецца прыняць на сябе першы ўдар. Пра тое, у якой ступені гатоўнасці падыходзяць да кантынентальнага спартыўнага форуму супрацоўнікі МНС, карэспандэнту «Звязды» расказаў памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.

Заняткі на аб'ектах

— Падрыхтоўка да II Еўрапейскіх гульняў пачалася яшчэ ў 2017 годзе. Мы скарысталіся напрацоўкамі з часоў чэмпіянату свету па хакеі, які быў першым настолькі буйным мерапрыемствам у сучаснай гісторыі Беларусі. Дадатковы досвед мы атрымалі летась, калі ездзілі на разнастайныя спартыўныя арэны, дзе праводзіліся матчы чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, — паведаміў Віталь Навіцкі.

Мы правялі трынаццаць гарнізонных тактыка-спецыяльных вучэнняў. Іх аб'ектамі сталі «Мінск-Арэна», «Чыжоўка-Арэна», Палац спорту, Прэзідэнт-атэль, аўтавакзал «Цэнтральны», стадыён «Дынама»... Гэта — не лічачы соцень тактыка-спецыяльных заняткаў на ўсіх спартыўных аб'ектах і ва ўсіх месцах пражывання.

Фота БелТА.

Важна, што заняткі праводзіліся з кожнай дзяжурнай зменай. Мы ставілі за мэту, каб усе нашы супрацоўнікі асвяжылі ў памяці планіроўку гэтых аб'ектаў. Большасць з іх для нас не новая. Але, у прыватнасці, Нацыянальны Алімпійскі стадыён «Дынама» быў вельмі істотна перабудаваны. І таму было важна, каб усе нашы супрацоўнікі знаёміліся з новай планіроўкай не па планах, а непасрэдна на месцах.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЛІДАРЫ КІТАЯ І ЗША МЯРКУЮЦЬ ПРАВЕСЦІ РАБОЧУЮ ВЯЧЭРУ Ў ОСАЦЫ

Старшыня КНР Сі Цзіньпін і прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, як чакаецца, сустрэнуцца ў фармаце рабочай вячэры на палях саміту G20, які пройдзе ў Осацы 28—29 чэрвеня, паведаміла газета South China Morning Post. «Гэта будзе, па сутнасці, паўторам [фармату] саміту ў Аргенціне ў снежні мінулага года», — адзначыла выданню крыніца, знаёмая з ходам падрыхтоўкі мерапрыемства. Трамп паведаміў журналістам пра запланаваную сустрэчу з Сі Цзіньпінам на G20. Разам з тым амерыканскі лідар у інтэрв'ю тэлекампаніі CNBC папярэдзіў, што ўлады ЗША неадкладна ўвядуць дадатковыя пошліны на кітайскія тавары, калі старшыня КНР не прыедзе на саміт G20 у Осаку. На думку апытаных ганконгскай газетай аналітыкаў, сустрэча паміж лідарамі дзвюх краін ва ўмовах цяперашняга абвастрэння гандлёвай вайны паміж ЗША і Кітаем уяўляецца вельмі актуальнай, нават калі яна не паўплывае на ўрэгуляванне супярэчнасцяў. «Глабальныя фондавыя рынкі хочуць упэўненасці ў тым, што каналы камунікацый на вышэйшым узроўні паміж лідарамі дзвюх вядучых эканамічных дзяржаў застаюцца адкрытыя», — адзначыў дэкан Школы бізнесу Маямі Джон Квелч.

НА ПАСАДУ ПРЭМ'ЕРА БРЫТАНІІ ПРЭТЭНДУЮЦЬ 10 КАНДЫДАТАЎ

За пасаду кіраўніка Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі, а таксама прэм'ер-міністра краіны будуць змагацца 10 кандыдатаў. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным паведамленні кіруючага камітэта партыі. Сярод кандыдатаў значацца былы міністр замежных спраў Борыс Джонсан, кіраўнік Мінпрыроды Майкл Гоўв, экс-лідар палаты абшчын Андрэа Лідсам, а таксама дзеючы кіраўнік Міністэрства замежных спраў Джэрэмі Хант, былы міністр па пытаннях Brexit Дамінік Рааб, міністр міжнароднага развіцця Роры Сцюарт, кіраўнік МУС Саджыд Джавід. Акрамя гэтага, за пасаду прэм'ера пазмагаецца кіраўнік брытанскага Міністэрства аховы здароўя Мэцью Хэнкак, кіраўнік Мінпрацы Эстэр Макві, а таксама прадстаўнік Мінфіна пры палаце абшчын Марк Харпер. Палітолагі прагназуюць, што нягледзячы на такую колькасць прэтэндэнтаў, барацьба разгорнецца паміж Джонсанам, Хантам, Раабам і Гоўвам. Паведамляецца, што новы прэм'ер уступіць у свае правы бліжэй да канца ліпеня, а да гэтага часу выконваць абавязкі кіраўніка ўрада Вялікабрытаніі будзе Тэрэза Мэй, якая склала з сябе паўнамоцтвы 7 чэрвеня.

САРАНЧА АТАКАВАЛА ВОСТРАЎ САРДЗІНІЯ

Саранча знішчае ўраджай на італьянскім востраве Сардзінія. Наймацнейшае за апошнія 60 гадоў нашэсце насякомых звязваюць з надыходам анамальнай спякоты, якая ўсталявалася пасля доўгага перыяду халоднага і дажджлівага надвор'я. Саранча спустошыла ўжо звыш 2000 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. «Усё пачалося каля месяца таму, — расказаў Euronews фермер Луіджы Пуджыоні. — Яны былі маленькімі лічынкамі, а цяпер вельмі хутка растуць і знішчаюць усё на сваім шляху». У асацыяцыі фермераў Італіі заяўляюць, што велізарная колькасць насякомых таксама імкліва з'ядае сена, прызначанае для корму жывёл.

ISSN 1990 - 763X

КОРАТКА

- У Віцебску адбылося выязное пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю «Славянскі базар» пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі.
- **Сярэдні заробак у Салігорскім раёне ў 2020 годзе чакаецца каля Br1,6 тысячы.**
- У Брэсце завяршылася мадэрнізацыя будынка гарадской бальніцы хуткай меддапамогі.

Рэтрыты, арт-падарожжы, паломніцтва...

Які адпачынак модны ў беларусаў

Сучасных беларусаў ужо далёка не заўсёды задавальняе традыцыйны пляжны адпачынак у Егіпце і Турцыі ці класічныя экскурсійныя паездкі. Многія шукаюць чагосьці новенькага, мараць не пра звычайнае падарожжа, а пра паездку, дзе можна было б «перазагрузіцца», натхніцца, атрымаць нейкі новы вопыт. І такіх прапаноў цяпер хапае. Такім чынам, якія новыя кірункі турызму атрымліваюць усё большае развіццё апошнім часам?

Ёга-туры і псіхалагічныя рэтрыты

А таксама падарожжы да месцаў сілы і гэтак далей... Звычайна арганізуюць такія туры псіхолагі і псіхатэрапеўты, інструктары ёгі і медытацыі.

Абяцаюць рознае, у залежнасці ад кірунку. Найчасцей кажуць, што вы зразумееце свае сапраўдныя жаданні, навучыцеся абыходзіць перакананні, якія вас абмяжоўваюць, пачняце дзейнічаць і мяняць сваё жыццё да лепшага. А яшчэ могуць быць спецыялізаваныя рэтрыты, на якіх вас могуць навучыць, як спраўляцца са сваімі крыўдамі, страхамі, або, напрыклад гневам.

Такія туры арганізуюць на прыродзе, далёка ад гарадскога шуму. Але, напрыклад, ёга-рэтрыт — гэта не звычайны адпачынак на свежым паветры, да якога мы прывыклі. Кожны дзень яго ўдзельнікаў чакаюць практыкі ёгі, прычым, як звычайна сцвярджаюць трэнеры, вопыт пры гэтым не абавязковы. Дні, насычаныя заняткамі ёгай, медытацыямі (па жаданні), з сустрэчамі світання і любаваннем захадам сонца, з арганізаваным здаровым, часцей за ўсё вегетарыянскім харчаваннем, дапамагаюць разгрузіць арганізм, скінуць лішнія кілаграмы і аднавіць сілы.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!